ПАДЗЕЯ

# СЭРЦА І СЛОВА – ЛЮБІМАМУ ГОРАДУ

**21 снежня ў аддзеле мастацтва Гродзенскай абласной навуковай бібліятэкі імя Я. Карскага прэзентавалі зборнік літаратурна-мастацкіх твораў да 895-годдзя горада Гродна «Лепшы горад Зямлі» (Гродна, «ЮрСаПрынт», 2023). Літаратурна-музычная імпрэза супала з днём заснавання Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі (21 снежня 2005 года).**



Год свайго юбілейнага 895-годдзя Гродна сустрэў цэлым шэрагам урачыстасцяў і значных падзей. І хоць юбілей адзначаўся ў верасні, – у снежні, на фінішы юбілейнага года літаратары падарылі яшчэ адну нагоду для радасці – свята знаёмства з кнігай прысвячэнняў гораду над Нёманам. Прыемна і прыгожа, што светлае свята мастацтва прыйшлося на «дзень нараджэння» пісьменніцкай арганізацыі вобласці. Пра гэта ў сваім уступным слове сказала старшыня Гродзенскага абласнога аддзялення СПБ Людміла Антонаўна Кебіч *(на фота),* чалавек, якому належыць ідэя выдання зборніка. Шмат цікавага паведаміла ў сваёй прамове літаратуразнаўца, член СПБ, кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры беларускай філалогіі ГрДУ імя Янкі Купалы, лаўрэат Нацыянальнай літаратурнай прэміі (2023) Аліна Сабуць. А яшчэ больш карыснай інфармацыі змешчана ва ўступным артыкуле Аліны Эдмундаўны ««Гродна мае твар адметны: горад-казка, горад-рай»: ушанаванне Гродна пісьменнікамі Гродзенскага краю (да юбілейнага 895-годдзя горада)». Па традыцыі асобнік кніжнай навінкі атрымала галоўная бібліятэка вобласці ў асобе яе дырэктара, галоўнага бібліятэкара Прынёмання Марыны Эдвардаўны Ігнатовіч. З кранальным творчым падарункам – выкананнем песні на ўласныя словы «Вулкі Гародні» (музыка Генадзя Кебіча) выступіла Людміла Антонаўна Кебіч. Кіраўнік прачытала свой верш «Лепшы горад» і выступіла ў ролі вядучай

імпрэзы. Свае творы, прысвечаныя вобразу старажытнага і вечна маладога Гродна, старонкам яго багатай гісторыі, агучылі члены Саюза пісьменнікаў Беларусі, прадстаўнікі Гродзенскага гарадскога літаратурнага аб'яднання «Надзея», аматары літаратуры рознага ўзросту. Сярод іх: Святлана Глембоцкая, Таццяна Лугавая, Браніслаў Ермашкевіч, Мікалай Іваноўскі (Ваўкавыскі раён), Павел Нікалаеў, Рыгор Гармаш, Наталля Чakліна-Гарбачова, Кацярына Каламійцава, Ганна Скаржынская-Савіцкая, Алена Руж, Святлана Барнавалава і іншыя. У рэпертуары выступоўцаў, як і ў змесце зборніка «Лепшы горад Зямлі», пераважала паэзія. Ветэран працы, архівіст, гісторык Карына Пятроўна Батракова выступіла з прэзентацыяй свайго артыкула «Волшебные звуки музыки», прысвечанага даўнім, багатым традыцыям музычнага мастацтва ў Гродне. Дзмітрый Радзівончык і Сяргей Трашко пазнаёмілі аўдыторыю з нечаканым, загадкавым вобразам Гродна, які паўстае ў іх канспіралагічным нарысе «Гродно незримый». Член СПБ, паэт, бард Анатоль Апанасевіч выканаў аўтарскую песню «Гарадзенскі вальс».

Праграма прэзентацыі атрымалася разнастайнай, як і сама выява горада, увасобленая ў літаратурных творах. Сярод гэтай разнастайнасці ёсць і вобраз прыгранічнага Гродна. У літаратараў Прынёманскага краю склаліся цёплыя, сяброўскія адносіны з вайскоўцамі Гродзенскай пагранічнай групы; традыцыяй сталі нашы літаратурныя сустрэчы, выступленні на заставах. Матыў слаўнага подзвігу вартавых дзяржаўнай мяжы выразна прагучаў на старонках новай кнігі. Таму ў яе прэзентацыі прынялі ўдзел артысты аркестра Гродзенскай пагранічнай групы (начальнік аркестра Сяргей Паўлавіч Аляксеенка) і выканалі песню на словы Людмілы Кебіч і музыку Ірыны Трацціяк «Граница». Аднайменны твор з ваенна-патрыятычнай лірыкі члена СПБ, паэта Віктара Куца (1940-2023) натхнёна і артыстычна прадэкламавала загадчык аддзела мастацтва ГАНБ імя Я. Карскага Аксана Жук. Было яшчэ шмат музыкі, прыўзнятага настрою, яркіх эмоцый і шчырых пачуццяў да нашага непаўторнага Гродна, які ў чарговы раз натхніў сваіх жыхароў на творчасць, на мірную, стваральную працу. Свята атрымалася. Свята мастацтва і любові да роднага краю, да сваіх каранёў і вытокаў. Канчаецца юбілейны для Гродна год. Але свята застаецца. На старонках літаратурнага зборніка «Лепшы горад Зямлі» цяпер яно будзе з намі заўсёды.

**САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ**
**Гродзенскае абласное аддзяленне**

**На здымках:** эпізоды прэзентацыі зборніка літаратурна-мастацкіх твораў да 895-годдзя горада Гродна «Лепшы горад Зямлі». Аддзел мастацтва Гродзенскай абласной навуковай бібліятэкі імя Я. Ф. Карскага. 21 снежня 2023 года.








**Выступае аўтар прадмовы да зборніка, член СПБ, лаўрэат Нацыянальнай літаратурнай прэміі Беларусі (2023), літаратуразнаўца, літаратурны крытык Аліна Сабуць**






**Асобнік кнігі «Лепшы горад Зямлі» атрымала дырэктар Гродзенскай абласной навуковай бібліятэкі імя Я. Ф. Карскага Марына Эдвардаўна Ігнатовіч**




**Ля мікрафона кіраўнік Гродзенскага гарадскога літаратурнага аб’яднання «Надзея», паэтэса Святлана Глембоцкая**




**Выступае член Гродзенскага гарадскога літаратурнага аб’яднання «Надзея», паэтэса Таццяна Лугавая**



**Ганаровы член Саюза пісьменнікаў Беларусі, паэт Браніслаў Ермашкевіч**



**Член СПБ, паэт Мікалай Іваноўскі (Ваўкавыскі раён)**



**Верш «Граница» члена СПБ, паэта Віктара Куца (1940-2023) натхнёна і артыстычна прадэкламавала загадчык аддзела мастацтва ГАНБ імя Я. Карскага Аксана Жук**






**Гучыць песня на словы Людмілы Кебіч і музыку Ірыны Траццяк «Граница»**





Выступае ветэран педагагічнай працы, паэт Павел Нікалаеў




Член СПБ, паэт Рыгор Гармаш



**Таксама юбіляр-2023, ветэран педагагічнай працы, паэтэса, празаік Наталля Чакліна-Гарбачова сёлета адзначыла сваё 90-годдзе**



**Лаўрэат IV Абласнога конкурсу рукапісаў імя Цёткі (А. Пашкевіч), гродзенская паэтэса Кацярына Каламійцава**



**Член СПБ, лаўрэат Нацыянальнай літаратурнай прэміі Беларусі (2015), дзіцячая пісьменніца Ганна Скаржынская-Савіцкая**



**Член СПБ, паэт, бард Анатоль Апанасевіч. «Гарадзенскі вальс»**






**Паэтэса Алена Руж**



Паэтэса Святлана Барнавалава



Карына Пятроўна Батракова, архівіст, гісторык, ветэран працы





**Дзмітрый Радзівончык і Сяргей Трашко (старонка 156)**


«Лепшы
торфа зямлі»






**Празаік, дзіцячы пісьменнік Галіна Богдан (Ліна Багданава); літаратуразнаўца, літаратурны крытык, паэтэса Алена Руцкая; дзіцячая пісьменніца Ганна Скаржынская-Савіцкая**



**Дзмітрый Радзівончык і Ліна Багданава**



**Ліна Багданава і Алена Руцкая**




**Фота** Сняжаны Дашкевіч,
Аляксандра Сявенкі,
Аліны Сабуць,
Ліны Багданавай

**Пра падзею –** [на сайце Гродзенскай абласной навуковай бібліятэкі імя Я. Ф. Карскага.]

---

*Шаноўныя сябры!*

*Калі вы жадаеце мець у сваёй бібліятэцы зборнік літаратурна-мастацкіх твораў да 895-годдзя горада Гродна «Лепшы горад Зямлі», або жадаеце выкарыстаць гэтую ўнікальную, рарытэтную кнігу ў якасці арыгінальнага памятнага падарунка, калі ласка, спяшайцеся яе набыць (наклад абмежаваны)! Для гэтага звяртайцеся ў Гродзенскае абласное аддзяленне Саюза пісьменнікаў Беларусі па тэлефонах:*

**(8-0152) 60-20-22 і (8-0152) 60-48-98**

---